Семантычны спосаб утварэння беларускіх і рускіх прававых тэрмінаў з'яўляецца прадуктыўным на ўсіх этапах развіцця правазнаўчай тэрміналогіі абедзвюх моў.

ГСБМ – Гістарычны слоўнік беларускай мовы. Вып. 1–35. Мінск, 1982–2015.
СРЯ – Словарь русского языка XI–XVII вв. Вып. 1–26. М., 1975–2002.
Матер. – Срезневский И. И. Материалы для словаря древнерусского языка: в 3 т. Т. 1–3. СПб., 1893–1903.
ТСБЛМ –Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы. 3-е выд. Мінск, 2002.
ЭСРЯ – Фасмер М. Этимологический словарь русского языка: в 4 т. Т. 1–4. М., 1964–1973.
ЮЭС – Юрыдычны энцыклапедычны слоўнік / Рэдкал.: С. В. Кузьмін [і інш.]. Мінск, 1992.

1. Антанюк Л. А. Спецыяльная лексіка беларускай мовы. Тэрміналогія: вучэб. дапам. 2-е выд. Мінск, 2005.
2. Буракова М. У. Юрыдычная тэрміналогія ў беларускай мове: аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук. Гомель, 2004.
3. Даниленко В. П. Русская терминология. Опыт лингвистического описания. М., 1977.
4. Золтан А. Interslavica. Исследования по межславянским языковым и культурным контактам. М., 2014.
5. Лейчик В. М. Терминоведение: предмет, методы, структура. 2-е изд., испр. и доп. М., 2006.
6. Плотников Б. А. Основы семасиологии: учеб. пособие. Минск, 1984.
7. Потебня А. А. Из записок по русской грамматике. М., 1958.
8. Семереньи О. Введение в сравнительное языкознание. М., 1980.
9. Степанова М. Д. Методы синхронного анализа лексики. М., 1968.

***З. І. Бадзевіч,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*загадчык кафедры сучаснай беларускай мовы БДУ*

## Аснова як структурная частка слова

Побач з марфемамі ў якасці асобага сегмента ў структуры слова выдзяляецца яго аснова.

У сучаснай лінгвістычнай літаратуры паняцце асновы вытлумачваецца неаднагначна. Так, у акадэмічнай «Беларускай граматыцы» (1985) асновай называецца «… частка слова без флексіі (канчатка), у ёй заключана індывідуальнае лексічнае значэнне слова (у корані – агульнае значэнне роднасных слоў)» [1, с. 215]. У вучэбным дапаможніку «Сучасная беларуская мова» дадзена наступнае азначэнне: «Аснова – частка формы слова без канчатка, формаўтваральных суфіксаў інфінітыва *-ць, -ці, -чы* і постфікса *-це* (у форме 2-й асобы множнага ліку дзеясловаў загаднага ладу), якая выражае лексічнае значэнне слова» [3, с. 208]. У падручніку беларускай мовы для 5-га класа прапануецца такое азначэнне «У аснову не ўваходзяць канчаткі і суфіксы, якія ўтвараюць формы слова» [2, с. 43]. Такога тыпу разначытанні з'яўляюцца свед-

чаннем недастатковай распрацаванасці шэрагу пытанняў словаўтварэння і граматыкі. Нягледзячы на розныя вытлумачэнні азначэння да асновы слова, ва ўсіх гэтых азначэннях агульным з'яўляецца тое, што аснова лічыцца абавязковым элементам марфемнай структуры слова і сродкам выражэння яго лексічнага значэння, а гэта дае падставы да наступнага яе азначэння: **аснова** – гэта абавязковы і пастаянны (нязменны па значэнні і структуры) элемент марфемнай структуры слова, які з'яўляецца сродкам выражэння лексічнага значэння. Зменныя словы складаюцца з пэўнай сукупнасці словаформ. Пры супастаўленні словаформ аднаго і таго ж слова, у кожнай словаформе вычляняюцца пастаянная і пераменная часткі. Параўн.: *нов-ы, нов-ая, нов-ае, нов-ыя, нов-ага, нов-аму, нов-ым; кніг-а, кніг-і, кніз-е, кніг-у, кніг-ай, кніз-е; піса-ць, піса-ў, піш-у, піш-аш, піш-а, піш-ам, піш-аце, піш-уць; прачыта-ць, прачыта-ў, прачыта-н-ы, прачыта-ўшы*. У пастаяннай частцы заключаецца асноўнае лексічнае значэнне, якое аб'ядноўвае іх у адно слова – лексему. Пераменная частка словаформ звязана з выражэннем розных граматычных значэнняў і прадстаўлена сістэмай словазменных афіксаў.

У адрозненне ад таго, у якіх працэсах змянення слова ўдзельнічае аснова, адрозніваюць асновы **граматычныя**, звязаныя са змяненнем слоў: скланеннем, спражэннем (*руж-а, руж-ы, руз-е…; сін-і, сін-яга, сін-яму…; вуч-у, вуч-ыш, вуч-ыць…*), утварэннем розных граматычных форм (*леп-ш-ы, карац-ейшы; думаў, думала, думалі, дума-ючы*); і асновы **лексічныя**, якія ўдзельнічаюць пры ўтварэнні новых слоў (*смел-ы – смеласць-ø, чул-ы – чуллів-ы – чуллівасць*).

У залежнасці ад таго, што прымаецца за зыходнае: слова ў канкрэтнай граматычнай форме ці агульная частка ўсіх яго словаформ, выдзяляюцца два тыпы асноў: **аснова словаформы** і **аснова слова**.

**Аснова словаформы** – гэта частка слова без канчатка, напрыклад: *прачыта-ў-ø, прачыта-л-а* (асновы форм дзеясловаў прошлага часу; у асновы словаформ уваходзяць формаўтваральныя суфіксы прошлага часу *-ў* і *-л-*); *прачыта-н-ы* (аснова формы дзеепрыметніка прошлага часу; у аснову словаформы ўваходзіць суфікс *-н-*, які з'яўляецца паказчыкам формы залежнага стану дзеепрыметніка прошлага часу); *прачыта-[j-уць]* (аснова формы дзеяслова будучага часу; суфікс *-j-* – паказчык асновы цяперашняга часу і ўваходзіць у аснову словаформы; параўн.: *чыта-[j-уць]*); *прачыта-ўшы* (аснова формы дзеепрыслоўя закончанага трывання; суфікс *-ўшы* ўваходзіць у аснову словаформы); *прачытай-ø-це* (аснова формы дзеяслова загаднага ладу 2-й асобы множнага ліку; канчатак *-це* ў аснову не ўваходзіць); *пііш-ы-це* (аснова формы дзеяслова загаднага ладу 2-й асобы множнага ліку; суфікс *-ы-* ўваходзіць у аснову словаформы, канчатак *-це* не ўваходзіць); *мацн-ейш-ы* (аснова формы параўнальнай ступені якаснага прыметніка; суфікс *-ейш-* уваходзіць у аснову словаформы); *мацн-ей* (аснова формы параўнальнай ступені якаснага прыслоўя; суфікс *-ей* уваходзіць у аснову словаформы).

Часам пры формаўтварэнні могуць адбывацца змяненні асновы:

а) усячэнне асновы: *замерзнуць – замерз, далёкі – далей*;

б) нарашчэнне асновы: *ім-я – імён-ы, неб-а – нябёс-ы*;

в) суплетывізм асноў (ад лац. *suppleo* ‘узнаўляю’): *<u>чалавек</u> -ø – <u>людз</u>-і, <u>добр</u>-ы – <u>леп-ш</u>-ы, <u>м</u>-ы – <u>нас</u>-ø, <u>ён</u>-ø – яго [j-аго]* (канчатак *-аго*, корань *j*, аснова *j*), *<u>іс</u>-ці – <u>іша</u>-ў-ø, <u>іш</u>-л-і, <u>ід</u>-у*. Такога тыпу асновы характарызуюцца адзінствам семантыкі і розным фармальным выражэннем.

**Аснова слова** уяўляе сабой агульную частку ўсіх словаформ аднаго і таго ж слова, а значыць, гэта частка слова без канчатка і формаўтваральных суфіксаў. Напрыклад: *<u>дубок</u>-ø, <u>дубк</u>-а, <u>дубк</u>-ом, <u>дубк</u>-і…*; *<u>прачыта</u>-ў-ø, <u>прачыта</u>-л-а* (параўн.: *<u>прачыта</u>-ць*); *<u>мацн</u>-ейш-ы* (параўн.: *<u>моцн</u>-ы*). Аднак у некаторых выпадках адно і тое ж слова ў розных формах можа мець розныя асновы. Так, у граматычнай сістэме дзеясловаў выдзяляюцца два віды асноў: **аснова інфінітыва (прошлага часу)** і **аснова цяперашняга часу (будучага простага)** (аснову цяперашняга часу маюць дзеясловы незакончанага трывання, а аснову будучага простага часу – закончанага).

**Аснова інфінітыва (прошлага часу)** выдзяляецца шляхам адчлянення формаўтваральных суфіксаў *-ць, -чы*, радзей *-ці* (*<u>піса</u>-ць, <u>бераг</u>-чы*) ад формы інфінітыва ці формаўтваральнага суфікса *-л- (-ў)* ад формы прошлага часу (*<u>піса</u>-л-а, <u>піса</u>-ў, <u>бераг</u>-л*-а). Ад асновы інфінітыва ўтвараюцца формы дзеясловаў абвеснага ладу прошлага часу: *<u>напіса</u>-ць – <u>напіса</u>-ў, <u>напіса</u>-л-а, <u>напіса</u>-л-і*; формы ўмоўнага ладу: *<u>напіса</u>-ць – <u>напіса</u>-ў бы, <u>напіса</u>-л-а б, <u>напіса</u>-л-і б*; дзеепрыметнікі прошлага часу: *<u>напіса</u>-ць – <u>напіса</u>-н-ы, <u>напіса</u>-н-ая, <u>напіса</u>-н-ае, <u>напіса</u>-н-ыя*; дзеепрыслоўі закончанага трывання: *<u>напіса</u>-ць – <u>напіса</u>-ўшы.* Формаўтваральныя суфіксы інфінітыва *-ць, -ці, -чы* не ўдзельнічаюць не толькі пры ўтварэнні форм дзеяслова, але і пры ўтварэнні новых слоў, за выключэннем слова *жаніць-**б**-а*.

Аснова цяперашняга часу (будучага простага) выдзяляецца шляхам адчлянення асабовых канчаткаў 3-й асобы множнага ліку *-уць (-юць)* (у дзеясловах I спражэння), *-аць (-яць)* (у дзеясловах II спражэння): *<u>піш</u>-уць*, (*<u>чыта-[j</u>-уць], <u>вуч</u>-аць, <u>глядз</u>-яць.* Ад асновы цяперашняга (будучага простага) часу ўтвараюцца асабовыя формы цяперашняга (будучага простага) часу абвеснага ладу: *<u>нос</u>-яць – наш-у, нос-іш, нос-іць, нос-ім, нос-іце, нос-яць; <u>пранияс</u>-уць – прыняс-у, прыняс-еш, прыняс-е, прыняс-ём, прынес-яце, прыняс-уць*; формы загаднага ладу: *нас-і-ø – нас-і-це, прыняс-і-ø – прыняс-і-це*; дзеепрыметнікі цяперашняга часу *<u>дрыж</u>-аць – <u>дрыж</u>-ач-ы (ліст), <u>квітнеj</u>-уць – <u>квітнеj</u>-уч-ы (луг)*; дзеепрыслоўі незакончанага трывання: *<u>нос</u>-ячы, <u>квітнеj</u>-учы.*

Як бачым, у дзеясловаў з’яўляюцца два рады словаформ: адзін рад мае агульную інфінітыўную частку ўсіх словаформ (*чыта-ць – чыта-ў, чыта-л-а…*), а другі – асабовую частку ўсіх словаформ (*чытаj-уць – чытаj-у, чытаj-эш…, чытаj-учы*). Асновы інфінітыва і цяперашняга часу могуць супадаць (параўн.: *<u>нес</u>-ці – <u>няс</u>-уць, <u>бераг</u>-чы – <u>бераг</u>-уць*), а могуць і не супадаць (параўн.: *<u>вастры</u>-ць – <u>востр</u>-аць, <u>стагна</u>-ць – <u>стогн</u>-уць, <u>піса</u>-ць – <u>піш</u>-уць*).

У некаторых назоўніках таксама магчыма несупадзенне ў асновах адзіночнага і множнага ліку, а г.зн., што аснова слова і тут не з’яўляецца сукупнасцю ўсіх яго граматычных форм, а толькі пэўнай часткі парадыгмы. Напрыклад, у словах *<u>грамадз-ян-ін</u>-ø, <u>мінч-ан-ін</u>-ø, <u>сел-ян-ін</u>-ø* выдзяляецца

сінгулятыўны суфікс -*ін*-, а ў множным ліку ён адсутнічае *грамадз-ян-е, мінч-ан-е, сял-ян-е.*

Калі ў словаформах адсутнічаюць формаўтваральныя суфіксы, то аснова слова супадае з асновай словаформы, параўн.: *стог-ø, стог-а, стог-у…; хат-а, хат-ы, хац-е…; вясёл-ы, вясёл-ага, вясёл-аму…; дв-а, дв-ух, дв-ум…; ціх-а*. У нескланяльных назоўніках усё слова таксама з’яўляецца асновай: *таксі, шымпанзэ, рагу.*

Аснова слова ўяўляе сабой сукупнасць падобных па фанемным саставе асноў словаформ, якія ўваходзяць у парадыгму дадзенага слова. Асновы словаформ аднаго і таго ж слова могуць мець аднолькавы або нязначна адрозны фанемны састаў. Напрыклад, аснова ў слове *алень* ва ўсіх сваіх 12 словаформах застаецца нязменнай. Параўн.: *алень-ø, ален’-а, ален’-у, ален’-а, ален’-эм, (аб) ален’-і, ален’-і, ален’-аў, ален’-ам, ален’-аў, ален’-амі, (аб) ален’-ах*. Аднак аснова сваім фанемным саставам можа і відазмяняцца, тады ў межах асновы выдзяляюцца пэўныя варыянты. Напрыклад, аснова слова *лыжка* прадстаўлена таксама 12 асновамі словаформ: *лыжк-а, лыжк’-і, лыжц-ы, лыжк-у, лыжк-ай (-аю), (аб )лыжц-ы, лыжк’-і, лыжак-ø, лыжк-ам, лыжк’-і, лыжк-амі, (аб) лыжк-ах*. Асновы 6 словаформ маюць аднолькавы фанемны састаў – *лыжк-*, 3 – *лыжк’-*, 2 – *лыжц-*, 1 – *лыжак-*. Разам з тым, сярод 12 асноў словаформ, што ўваходзяць у аснову слова *лыжк-а*, выдзяляюцца 4 фанематычныя варыянты: *лыжк-* / *лыжк’-* / *лыжц-* / *лыжак-*, якія абумоўлены фанетычнымі законамі мовы: 1) пазіцыйным чаргаваннем па цвёрдасці / мяккасці канцавых зычных асновы (*к // к’*); 2) гістарычным чаргаваннем канцавых заднеязычных са свісцячымі (*к // ц*); 3) гістарычным чаргаваннем галосных з нулём гука (*а // ø*).

Характар вар’іравання асноў словаформ залежыць таксама ад граматычных характарыстык слова і ад яго часцінамоўнага значэння. Істотна адрозніваюцца па сваёй будове іменныя і дзеяслоўныя асновы. Звычайна асновы словаформ назоўнікаў і прыметнікаў заканчваюцца на зычны, таму вар’іраванне ў іменных асновах часцей звязана з чаргаваннем па цвёрдасці / мяккасці канцавога зычнага асновы (*дуб-ø, дуб-а, дуб-у..., (аб) дуб’-е: хат-а, хат-ы, хац’-е...; вузк’-і, вузкага,вузкаму…*), з чаргаваннем галосных унутры кораня (*сон-ø, сн-у…, дзень-ø, дн-я…*), чаргаваннем заднеязычных *г, к, х* са свісцячымі *з, ц, с* (*кніг-а..., (у) кніз-е...; стог-ø..,(аб) стоз-е; рук-а.., (у) руц-э...; страх-а…(на) страс-е, паверх-ø...;(на)паверс-е*) і інш. Для дзеяслоўных асноў словаформ характэрна чаргаванне свісцячых [*дз, ц, з, с]* з шыпячымі [*дж, ч, ж, ш*] (*вадзі-ць – вадж-у, плаці-ць – плач-у, вазі-ць – важ-у, касі-ць – каш-у*), чаргаванне губных з губнымі +[*л’*] (*купі-ць – купл-ю, паставі-ць – пастаўл-ю, кармі-ць – кармл-ю, графі-ць – графл-ю*). Асабліва ў беларускай мове ў дзеяслоўных асновах словаформ пашырана чаргаванне [л] // [ў] (*спявал-а – спяваў-ø, працавал-а – працаваў-ø*).

Такім чынам, аснова словаформы, як морф і словаформа, з’яўляюцца канкрэтнай, лінейнай (сінтагматычнай) адзінкай мовы, а аснова слова – гэта абагульненая, нелінейная (парадыгматычная) моўная адзінка, як марфема і слова.

Паводле **структуры** асновы слова і асновы словаформы характарызуюцца рознымі прыметамі.

Паводле здольнасці дзяліцца на марфемы асновы могуць быць **члянімымі** і **нечлянімымі**.

**Члянімыя асновы** – гэта асновы, якія ўяўляюць сабой спалучэнне кораня (каранёў) з адной ці некалькімі афіксальнымі марфемамі: *том-ік-ø, нов-еньк-і, с-пя-ва-ць, дзе-небудзь, казач-н-асць-ø, дв-ух-паверх-ов-ы, сін-е-зялён-ы*. Адпаведна, члянімая аснова здольная дзяліцца на марфемы, яна змяшчае не меней дзвюх марфем: абавязкова каранёвую марфему і мінімум адну афіксальную: *вод-н-ы, ляс-ок-ø, па-нов-аму, за-граб-а-ць.*

**Нечлянімыя асновы** – гэта асновы, якія складаюцца толькі з адной каранёвай марфемы: *том-ø, вад-а, чырвон-ы, хт-о, як-і, дв-а, пе-ць, мы-ць, дзе*.

У залежнасці ад вытворнасці асновы бываюць **вытворныя** і **невытворныя**.

Вытворныя асновы – гэта такія асновы, значэнне якіх растлумачваецца (матывавуецца) з дапамогай асноў аднакаранёвых слоў, больш простых па форме і па значэнні. Так, аснова слова лясок-ø – вытворная, паколькі яе значэнне можа быць растлумачана з дапамогай асновы слова лес-ø: лясок-ø – ‘маленькі лес’. Калі ж такая суадносная пры тлумачэнні значэння асновы адсутнічае, то аснова з’яўляецца невытворнай. Напрыклад, значэнне асноў у словах дом-ø, грыб-ø, вецер-ø, сін-і, чыт-а-ць, піс-а-ць, раз-у-ць нельга растлумачыць, паколькі гэтыя словы з’яўляюцца невытворнымі (нематываванымі).

Паняцці члянімасці / нечлянімасці, вытворнасці / невытворнасці не заўсёды супадаюць. Напрыклад, аснова слова *сінь-ø* вытворная (па форме і значэнні матывуецца асновай слова *сін-і*), але нечлянімая; яе марфемная структура складаецца з аднаго кораня, паколькі нулявы суфікс з’яўляецца сродкам утварэння новага слова, але як састаўная частка слова не выдзяляецца. І наадварот, асновы слоў тыпу *піс-а-ць, чыт-а-ць, ляж-а-ць* з’яўляюцца члянімымі, але невытворнымі. Як бачым, паняцце члянімасці шырэйшае за паняцце вытворнасці. Часцей вытворная аснова з’яўляецца члянімай, але не кожная члянімая аснова – вытворная.

Па колькасці каранёвых марфем асновы падзяляюцца на **простыя** і **складаныя**. Асновы, якія змяшчаюць адзін корань, называюцца **простымі**. Простыя асновы зменных слоў могуць быць як члянімымі, так і нечлянімымі. Параўн.: *граніт-н-ы, манумент-альн-асць-ø, пад-раз-дзел-ø, пры-гож-ы* і *колас-ø, дарог-а, вясёл-ы, смел-ы, чатыр-ы, восем-ø, жы-ць, шы-ць.* Простыя асновы нязменных слоў (прыслоўяў, службовых слоў і інш.) таксама могуць быць і члянімымі (*з-лев-а, у-перадз-е, па-бацьк-оў-ск-у*), і нечлянімымі (*метро, паліто, бра, дзе, тут*).

Асновы, якія змяшчаюць дзве і болей каранёвыя марфемы, называюцца **складанымі**: *стал-/е/-плав-/і/-льшчык-ø, рыб-/а/-лоў-ств-а, лес-/а/-стэп-ø, дв-/ух/-моў-н-ы.* Інтэрфіксы (злучальныя галосныя) заўсёды ўваходзяць у састаў асновы. Складаныя асновы заўсёды вытворныя і члянімыя.

Па сувязі марфем унутры асновы адрозніваюць **неперарывістыя** і **перарывістыя** асновы. У большасці слоў беларускай мовы асновы ўяўляюць сабой

комплекс непасрэдна звязаных адной марфемы з другой: *за-мор-ск-і, вы-слух-оў-ва-нн-е, муж-н-асць-ø, пра-сач-ы-ць*. Асновы ў гэтых словах уяўляюць сабой суцэльную гукавую паслядоўнасць фанем і, выдзяляючы марфемы, мы адчляняем толькі словазменныя афіксы, якія знаходзяцца ў абсалютным канцы слоў (словаформ). Унутры асновы няма службовых марфем, якія б раздзялялі аснову на часткі. Такія асновы называюцца **неперарывістымі**, ці **кампактнымі**.

Аднак у мове ёсць і такія словы, калі ўнутры знаходзяцца канчаткі (флексіі) ці формаўтваральныя суфіксы, а за імі размешчаны постфіксы. Асновы, раздзеленыя на часткі і якія існуюць у выглядзе перарывістай паслядоўнасці фанем, называюцца **перарывістымі**. У сучаснай беларускай мове перарывісты тып асновы характэрны для зваротных форм дзеяслова – інфінітыва, асабовых форм дзеяслова, дзееприслоўяў (*віта-ц-ца, вітај-э-цца, вітај-уц-ца, вітај-учы-ся, павіта-ўшы-ся*), няпэўных займеннікаў, раздзеленых унутранай флексіяй (*шт-о-сьці (шт-о-сь), хт-о- -небудзь*), слоў, якія маюць два карані: складаныя лічэбнікі (*пяць-ø-дзясят-ø, пяц-і-дзесяц-і, пяц-і-сот-ø*) і раздзельна зменныя словы тыпу *крэсл-а-ложак-ø, (у) крэсл-е-ложк-у, вагоне-рэстаран-е.*

Як бачым, наяўнасць абодвух тыпаў асноў абумоўлена іх функцыянальным адрозненнем: аснова словаформы забяспечвае ўтварэнне сінтаксічных форм слова (форм скланення і спражэння), а асновы слова прымаюць удзел ва ўтварэнні новых слоў. Іх выдзяленне пры марфемным аналізе выступае як аперацыйная адзінка аналізу слова, якая дазваляе размяжоўваць граматычныя формы і лексічнае ядро слова.

1. Беларуская граматыка: у 2 ч. / Рэд. М. В. Бірыла, П. П. Шуба. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск. Мінск, 1985.

2. Беларуская мова: Падручнік для 5-га кл. агульнаадукац. шк. з рус. мовай навуч. / Г. М. Малажай, Л. С. Васюковіч, З. М. Кавалевіч, С. Р. Рачэўскі. Мінск, 2003.

3. Сучасная беларуская мова: вучэб. дапам. / Л. М. Грыгор’ева [і інш.]; пад агул. рэд. Л. М. Грыгор’евай. 3-е выд., выпр. Мінск, 2010.

***І. А. Гапоненка,***

*доктар філалагічных навук,*

*прафесар кафедры гісторыі беларускай мовы БДУ*

## Матывацыйная аснова онімаў як аб’ект даследавання

Высвятленне матывацыйных асноў тапанімічных найменняў і асабовых імёнаў – адзін з самых папулярных напрамкаў лінгвістычнага даследавання онімаў, што тлумачыцца натуральнай цікавасцю людзей да сваіх каранёў, а значыць, і да гісторыі паходжання назваў родных паселішчаў, імёнаў і прозвішчаў.

У беларускай анамастыцы існуюць навуковыя працы, дзе з дастаткова высокай ступенню даставернасці выяўляецца ўтваральная база тапонімаў і антрапонімаў. У тапаніміцы этымалагічныя росшукі паспяхова праводзілі,